Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях
________________ В.Г.Чупрыс
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
16 ліпеня 2018 г.
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД – 6468 /вуч.

# УКРАІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА XIX–XX СТАГОДДЗЯЎ У ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ: ПАРАЎНАЛЬНА-ТЫПАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1-21 05 04 Славянская філалогія

2018 г.

Уч. № 162

Вучэбная праграма УВА складзена на аснове АСВА 1-21 05 04– 2013, вучэбнага плана УВА № Д21-088/вуч. ад 30.05.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

П.І.Навойчык, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Г.М.Хадасевіч, выкладчык беларускай мовы і літаратуры ЮК БДУ

А.У.Вострыкава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай тэорыі літаратуры
(назва кафедры)
(пратакол № 10 ад 22.06.2018 г.)

Навукова-метадычным Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 7 ад 13.07.2018 г.).

Зав. кафедрой
доцент Т.А. Морозова

Зав каф.

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях
_________________ В.І.Чупрыс
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
__________________2018 г.
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД – /вуч.

# УКРАІНСКАЯ ЛІТАРАТУРА XIX–XX СТАГОДДЗЯЎ У ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ: ПАРАЎНАЛЬНА-ТЫПАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:**

1-21 05 04 Славянская філалогія

2018 г.

Вучэбная праграма УВА складзена на аснове АСВА 1-21 05 04– 2013, вучэбнага плана УВА № Д21-088/вуч. ад 30.05.2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

П.І.Навойчык, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Г.М.Хадасевіч, выкладчык беларускай мовы і літаратуры ЮК БДУ

А.У.Вострыкава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай тэорыі літаратуры
(назва кафедры)
(пратакол № 10 ад 22.06.2018 г.)

Навукова-метадычным Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 7 ад 13.07.2018 г.).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна (спецсемінар) “Украінская літаратура XIX – XX стст. у еўрапейскім кантэксце: параўнальна-тыпалагічны аспект” прадугледжана стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 1-21 05 04 “Славянская філалогія”.

Праграма ахоплівае гісторыю і спецыфіку развіцця ўкраінскай літаратуры XIX – XX стагоддзяў у еўрапейскім кантэксце і скіраванна на яе асэнсаванне як часткі сусветнага літаратурнага працэсу. Асаблівая ўвага надаецца праблеме міжлітаратурных сувязяў, таму ў праграме акцэнтуецца ўвага на ідэйна-мастацкіх, праблемна-тэматычных і эстэтычных асаблівасцях кожнага перыяду, у рэчышчы і кантэксце якога прадугледжваецца аналіз творчасці таго ці іншага ўкраінскага пісьменніка альбо пэўнай мастацкай з’явы. Спецыфіка літаратурнага майстэрства раскрываецца ў арганічнай сувязі з гісторыяй і культурай украінцаў, беларусаў, а таксама іншыхеўрапейскіх народаў.

**Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны**

**Мэта вучэбнай дысцыпліны** – даць сістэматызаваныя веды пра асноўныя этапы і з’явы развіцця ўкраінскай літаратуры XIX–XX стагоддзяў у еўрапейскім кантэксце.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны:**

1. выявіць спецыфіку развіцця ўкраінскай літаратуры XIX–XX стст. у еўрапейскім кантэксце;
2. акрэсліць перспектыўныя шляхі самастойнай працы студэнтаў.

Вучэбная дысцыпліна адносіцца да цыкла дысцыплін спецыялізацыі.

**Сувязі** з іншымі сумежнымі вучэбнымі дысцыплінамі: гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (украінская), гісторыя беларускай літаратуры, гісторыя замежнай літаратуры, тэорыя літаратуры, уводзіны ў перакладазнаўства.

Праграма па спецсемінары абапіраецца на канцэптуальныя прынцыпы адукацыйна-выхаваўчых прыярытэтаў Рэспублікі Беларусь.

***Патрабаванне да кампетэнцый***

Засваенне вучэбнай дысцыпліны спецсемінара “Украінская літаратура XIX – XX стст. у еўрапейскім кантэксце: параўнальна-тыпалагічны аспект” павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных, сацыяльна-асабовых і прафесійных кампетэнцый:

***акадэмічныя:***

**АК-1.** Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

**АК-3.** Валодаць даследчымі навыкамі

**АК-4.** Умець працаваць самастойна.

**АК-8.** Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***сацыяльна-асабовыя:***

**САК-1.** Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

**САК-2.** Быць здольным да сацыяльных кантактаў.

***прафесійныя:***

**ПК-6.** Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку навучальных і выхаваўчых вынікаў.

**ПК-7.** Планаваць. арганізоўваць і весці навукова-даследчую працу ў галіне філалогіі (тэксталогіі).

**ПК-11.** Прымяняць сучасную методыку рэферэравання і рэдагавання тэкстаў.

**ПК-12.** Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах.

**ПК-22.** Вызначаць мэты інавацый і спосабы іх дасягненняў.

У выніку вывучэння дысцыпліны спецсемінара “Украінская літаратура XIX – XX стст. у еўрапейскім кантэксце: параўнальна-тыпалагічны аспект” студэнты павінны:

**ведаць:**

асноўныя асаблівасці гісторыі, эвалюцыі ўкраінскай літаратуры XIX–XX стагоддзяў, асноўныя перыяды яе развіцця ў суадносінах з літаратурнымі працэсамі ў еўрапейскіх краінах;

ідэйна-мастацкія характарыстыкі, жанравыя адметнасці кожнага з перыядаў развіцця ўкраінскай літаратуры;

творчую спадчыну найбольш значных пісьменнікаў розных перыядаў XIX–XX стагоддзяў і іх узаемасувязі з іншанацыянальнымі літаратурамі;

**умець**:

прадставіць украінскую літаратуру XIX–XX стст. як самастойную сістэму ў агульнаеўрапейскім кантэксце;

даць уяўленне аб тыпалагічных і ўнікальных яе асаблівасцях;

вызначаць прыкметы кожнага перыяду развіцця ўкраінскай літаратуры;

ахарактарызаваць літаратурныя напрамкі, плыні, школы;

прааналізаваць творчасць вядомых пісьменнікаў, прадугледжаных праграмай, вызначыць мастацкі метад;

акрэсліць заканамернасці сувязяў і ўспрымання ўкраінскай літаратуры ў Беларусі;

**валодаць**:

метадалогіяй аналізу літаратурнага працэсу, літаратурных напрамкаў, плыняў і мастацкіх метадаў;

пачатковым вопытам вызначэння аналагічных ці кантрастных па форме і зместу літаратурных з’яў;

навыкамі кампаратывісцка-тыпалагічнага вывучэння літаратуры;
асноўнымі прыёмамі тэксталагічнага аналізу мастацкага твора.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца ў 5 і 6 семестрах. Агульная колькасць гадзін, якая даецца на вывучэнне дысцыпліны спецсемінара“Украінская літаратура XIX – XX стст. у еўрапейскім кантэксце: параўнальна-тыпалагічны аспект” згодна з адукацыйным стандартам, складае:

для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі – 102 гадзіны, у тым ліку – 64 аўдыторныя гадзіны, з іх: практычных заняткаў – 56 гадзін, кіруемай самастойнай работы – 8 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Форма бягучай атэстацыі – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

1. **Асаблівасці параўнальна-тыпалагічнага падыходу ў літаратуразнаўстве.**
   1.1. Супастаўляльныя методыкі. Паняцці ўплываў, запазычанняў, тыпалагічных падабенстваў і адрозненняў у дачыненні да праблемы літаратурнага напрамку.
2. **Тыпалагічны даыход да вывучэння літаратурных напрамкаў.**
   2.1. Паняцце літаратурнага напрамку як тыпалагічна-параўнальнае.
3. **Літаратурныя напрамкі ўкраінскай літаратуры 19 ст. у еўрапейскім кантэксце.**
   3.1. Асаблівасці ўласна ўкраінскага і агульнаславянскага рамантызму ў еўрапейскім кантэксце.
   3.2. Т.Шаўчэнка і А.Міцкевіч – тыпалогія жанраў.
   3.3. Станаўленне крытычнага рэалізму – міжлітаратурны еўрапейскі кантэкст.
   3.4. Пейзаж у творчасці І.Нячуй-Лявіцкага і Э.Ажэшкі.
   3.5. Асаблівасці псіхалагізму ў раманах П.Мірнага, І.Франко і Б.Пруса, І.Тургенева і інш.
   3.6. Традыцыі філасофскай паэмы ў сусветнай літаратуры і творчасці І.Франко.
4. **Праявы мадэрнісцкіх плыняў мяжы 19–20 стст. у творчасці буйнейшых пісьменнікаў Украіны і свету: агульнае і адрознае.**
   4.1. Ідэйна-эстэтычныя вытокі мадэрнізму ў мастацтве.
   4.2. Імпрэсіянізм і навелістыка М.Кацюбінскага, А.Чэхава, Гі дэ Мапасана.
   4.3. Праявы экспрэсіянізму і ўплыў польскіх мадэрністаў на творчасць В.Стэфаніка.
   4.4. Асаблівасці жанру драматычнай паэмы і паэтыка неарамантызму ў творчасці Лесі Украінкі і Янкі Купалы.
   4.5. Мастацкае асэнсаванне ідэй фемінізму ў творчасці Жорж Санд і В.Кабылянскай.
5. **Літаратурны працэс XX ст.**
   5.1. Мастацкія групы і плыні ў літаратуры 1920-х гадоў – усходнеславянскі кантэкст
   5.2. Дынаміка жанравых структур у літаратурыУкраіны і іншых народаў СССР 30-50 гадоў XX ст.
   5.3. Уплыў еўрапейскага постмадэрнізму на літаратуру Украіны канца XX – пачатку XXI стст.
6. **Кантактныя сувязі.**
   6.1. Пераклад як форма кантактных сувязей.
   6.2. Беларуска-ўкраінскі ўзаемапераклад.
   6.3. Пераклады паэзіі Т.Шаўчэнкі на беларускую мову.
7. **Тыпалагічны аналіз мастацкага твора**
   7.1. Прынцыпы тыпалагічнага аналізу і ўзроўні супастаўлення.
   7.2. Асаблівасці драматургіі А.Карняйчука і Кандрата Крапівы

7.3. Жанрава-тэматычныя сыходжанні ў паэзіі Паўло Тычыны, Максіма Рыльскага і беларускіх класікаў.
7.4. Развіццё жанру гістарычнага рамана ў творчасці Р.Іванычука і У.Караткевіча.
7.5. Гуманістычны пафас раманістыкі А.Ганчара і І.Мележа.
7.6. Рэцэпцыя еўрапейскай літаратурнай класікі XX ст. у літаратуры Украіны.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумарраздзела, тэмы | Назвараздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныяз аняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 9 |
| **1.** | **Асаблівасці параўнальна-тыпалагічнага падыходу ў літаратуразнаўстве.** | | | | |
| 1.1. | Супастаўляльныя методыкі. Паняцці ўплываў, запазычанняў, тыпалагічных падабенстваў і адрозненняў. | | 4 | | Адкрытае (эўрыстычнае) заданне |
| **2.** | **Тыпалагічны падыход да вывучэння літаратурных напрамкаў.** | | | | |
| 2.1. | Паняцце літаратурнага напрамку як тыпалагічна-параўнальнае. | | 2 | | Рэферат (даклад) |
| **3.** | **Літаратурныя напрамкі ўкраінскай літаратуры 19 ст. у еўрапейскім кантэксце.** | | | | |
| 3.1. | Асаблівасці ўласна ўкраінскага і агульнаславянскага рамантызму ў еўрапейскім кантэксце. | | 2 | 2 | Рэферат (даклад) |
| 3.2. | Т.Шаўчэнка і А.Міцкевіч – тыпалогія жанраў. | | 2 | | Адкрытае (эўрыстычнае) заданне |
| 3.3. | Станаўленне крытычнага рэалізму – міжлітаратурны еўрапейскі кантэкст. | | 2 | | Эсэ |
| 3.4. | Пейзаж у творчасці І.Нячуй-Лявіцкага і Э.Ажэшкі. | | 2 | | Вуснае апытанне |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 3.5. | Асаблівасці псіхалагізму ў раманах П.Мірнага і Б.Пруса, І.Тургенева і інш. | | 2 | | Рэферат (даклад) |
| 3.6. | Традыцыі філасофскай паэмы ў сусветнай літаратуры і творчасці І.Франко. | | 2 | | Адкрытае (эўрыстычнае) заданне |
| **4.** | **Праявы мадэрнісцкіх плыняў мяжы 19–20 стст. у творчасці буйнейшых пісьменнікаў Украіны і свету: агульнае і адметнае.** | | | | |
| 4.1. | Ідэйна-эстэтычныя вытокі мадэрнізму ў мастацтве. | | 2 | | Вуснае апытанне |
| 4.2. | Імпрэсіянізм і навелістыка М.Кацюбінскага, А.Чэхава, Гі дэ Мапасана. | | 2 | 2(ДА) | Пісьмовая работа з заданнямі рознага тыпу |
| 4.3. | Праявы экспрэсіянізму і ўлыў польскіх мадэрністаў на творчасць В.Стэфаніка. | | 2 | 2(ДА) | Пісьмовая работа з заданнямі рознага тыпу |
| 4.4. | Асаблівасці жанру драматычнай паэмы і паэтыка неарамантызму ў творчасці Лесі Украінкі і Янкі Купалы. | | 2 | | Эсэ |
| 4.5. | Мастацкае асэнсаванне ідэй фемінізму ў творчасці Жорж Санд і В.Кабылянскай. | | 2 | | Вуснае апытанне |
| **5.** | **Літаратурны працэс ХХ ст.** | | | | |
| 5.1. | Мастацкія групы і плыні ў літаратуры 1920-х гадоў – усходнеславянскі кантэкст | | 2 | | Рэферат (даклад) |
| 5.2. | Дынаміка жанравых структур у літаратурыУкраіны і рэспубліках Савецкага Саюза 30-50 гадоў ХХ ст. | | 2 | | Эсэ |
| 5.3. | Уплыў еўрапейскага постмадэрнізму на літаратуру Украіны канца ХХ – пачатку ХХІ стст. | | 4 | | Вуснае апытанне |
| **6.** | **Кантактныя сувязі.** | | | | |
| 6.1. | Пераклад як форма кантактных сувязей. | | 2 | | Вуснае апытанне |
| 6.2. | Беларуска-ўкраінскі ўзаемапераклад. | | 2 | 2(ДА) | Пісьмовая работа з заданнямі рознага тыпу |
| 6.3. | Пераклады паэзіі Т.Шаўчэнкі на беларускую мову. | | 2 | | Вуснае апытанне |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **7.** | **Тыпалагічны аналіз мастацкага твора** | | | | |
| 7.1. | Прынцыпы тыпалагічнага аналізу і ўзроўні супастаўлення. | | 2 | | Вуснае апытанне |
| 7.2. | Асаблівасці драматургіі М.Куліша ў еўрапейскім кантэксце. | | 2 | | Вуснае апытанне |
| 7.3. | Жанрава-тэматычныя сыходжанні ў паэзіі Паўло Тычыны, Максіма Рыльскага і беларускіх класікаў. | | 2 | 2 | Вуснае апытанне |
| 7.4. | Развіццё жанру гістарычнага рамана ў творчасці Р.Іванычука і У.Караткевіча. | | 2 | 2(ДА) | Пісьмовая работа з заданнямі рознага тыпу |
| 7.5. | Гуманістычны пафас раманістыкі А.Ганчара і І.Мележа. | | 2 | | Вуснае апытанне |
| 7.6. | Рэцэпцыя еўрапейскай літаратурнай класікі XX ст. у літаратуры Украіны. | | 4 | | Вуснае апытанне |
| | **Усяго:** | | **56** | **8** | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## СПІС АСНОЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Гісторыя славянскіх літаратур і праблемы іх параўнальнага вывучэння: тэорыя і практыка : вучэб. дапам. / склад. П. І. Навойчык ; пад агул. рэд. Т. В. Кабржыцкай, М. М. Хмяльніцкага. – Мінск : БДУ, 2015. – 207 с.
2. Гісторыя ўкраінскай літаратуры : Украінска-беларуска-польскія літаратурныя дыялогі : вучэб. дапам. У 2 ч. Ч. 1. Міжкультурныя камунікацыі. Ад старажытнасці да XX ст. / Т. В. Кабржыцкая, М. М. Хмяльніцкі, Э. Ю. Дзюкава ; пад рэд. Т. В. Кабржыцкай. – Мінск : БДУ, 2012. – 231 с.
3. Гнідан О.Д. (ред.) Історія української літератури. Кінець XIX – початок XX ст.:У 2 кн. –Київ: Либідь, 2005. – Кн. 1. – 624 с.
4. Гнідан О.Д. (ред.) Історія української літератури. Кінець XIX – початок XX ст.:У 2 кн. – Київ: Либідь, 2006. – Кн. 2. –496 с.
5. Літературознавча компаративістика. Навчальний посібник /Ред. Р.Т.Гром'як., упоряд.: Р.Т.Гром'як, І.В.Папуша. — Тернопіль: Редакційно-видавничий відділ ТДПУ, 2002. — 331 с.
6. Наливайко Д. С. Спільність і своєрідність. Українська література в контексті європейського літературного процесу. — К.: Дніпро, 1988. — 395 с.
7. Рагойша, В. П. Украіна, цвеце любы… : дапам. для студэнтаў філ. фак. БДУ. — Мінск : БДУ, 2011. – 83 с.
8. Сучасна літературна компаративістика: стратегії і методи. Антологія / За заг. ред. Дмитра Наливайка. - К.: Вид. дім «Києво-Могилянська академія», 2009. – 487 с.
9. Украінская літаратура і ўкраінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі : вучэб. дапам. У 3 ч. Ч. 1. Эпоха Сярэднявечча — XIX ст. / Т. В. Кабржыцкая, У. В. Рагойша ; пад рэд. Т. В. Кабржыцкай. — Мінск : БДУ, 2012. — 215 с.
10. Украінская літаратура і ўкраінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі : вучэб. дапам. У 3 ч. Ч. 2. XIX – пачатак XX стагоддзя / Т. В. Кабржыцкая, В. П. Рагойша ; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2015. – 215 с.
11. Украінская літаратура і ўкраінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі : вучэб. дапам. У 3 ч. Ч. 3. 40-я гг. XX – пачатак XXI стагоддзя / Т. В. Кабржыцкая, В. П. Рагойша ; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск : БДУ, 2016. – 199 с.


## СПІС ДАДАТКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Аминева В. Р. О категориях сопоставительного литературоведения // www.ksu.ru/fil/kn1/index.php?sod=0.
2. Андреев Л.Г. Импрессионизм. М., 1980.
3. Афонина О. Послесловие // Байрон Дж.Г. Избранное. – М: Правда, 1986 – с. 417 – 445.

4. Ахрыменка П. Тарас Шаўчэнка і Беларусь. – Мінск, 1969.
5. Бернадська Н.І. Український роман: теоретичніпроблеми і жанроваеволюція. – К., 2004. – 367 с.
6. Богословский В.Н. и др. История зарубежной литературы XIX века. // В.Н. Богословский. – М.: Высшая школа, 1991
7. Бондаренко Л. Г. Вивчення ліричних творів на уроках української літератури у взаємозв'язку із зарубіжною (9—11 класи). Дис... канд. пед. наук: 13.00.02 — К., 2001. — 178 с
8. Гром'як Р. Методика реалізації рецептивного підходу до міжнаціональних літературних контактів // Літературна компаративістика, – Вип.1. – Київ, 2005.
9. Денисюк І. Розвиток української малої прози XIX–поч.XXст. Львів, 1999. –277 с.
10. Дима А. Принципы сравнительного литературоведения. – Москва, 1977.
11. Жирмунский В.М. Байрон и Пушкин (1924). С.5-17.
12. Жирмунский В.М. Сравнительное литературоведение. Восток и Запад. Л., 1979.
13. Забужко С. Хроніки від Фортінбраса. Вибрана есеїстика 90-х. –Київ: Факт, 1999. – 340 с.
14. Забужко О. Шевчеків міф України – Київ, 1997.
15. Задорожный М. Тайнопис Булгакова і Куліша // Персонал Плюс№ 46 (451) 16 - 22 листопада 2011.
16. Зборовська Н. Феміністичні роздуми. На карнавалі мертвих поцілунків. – Львів: Літопис, 1999. – 336 с.
17. Каспрук Арсен. Філософські поеми Івана Франка. — Київ, 1965.
18. Кузякіна. Н. Б. П'єси Миколи Куліша. – Київ, 1970.
19. Маріно А. Компаративістика та теорія літератури. Поетика порівняльного літературознавства / А. Маріно // Слово і Час. — 2007. — № 6. — С. 46-58.
20. Мелетинский Е. Историческая поэтика новеллы. – М., 1990.
21. Навойчык П. І. «Хачу міру ў людзях і чалавечнасці» (Мікола Куліш) // Славянскія літаратуры: Постаці (ІІ). Зборнік артыкулаў. – Мінск, 2003.
22. Наєнко М. Романтичний епос: Ефект романтизму і українська література. – К., 2000
23. Наливайко Д. Література в системі мистецтв як галузь компаративістики // Теорія літератури й компаративістика. - К., 2006. - С.19-23.
24. Наливайко Д. С. Спільність і своєрідність. Українська література в контексті європейського літературного процесу. — К.: Дніпро, 1988.
25. Павличко С. Дискурс модернізму в українській літературі. –Київ: Либідь, 1999. – 447 с.
26. Панченко В. Арки і шибениці: Драматургія М. Куліша. – Кіровоград, 1997.
27. Ревальд Дж. История импрессионизма. М., 1994.
28. Семенюк Г. М. Куліш і становлення української драматургії. – Київ, 1991.

29. Сравнительное и сопоставительное литературоведение: Хрестоматия / Я.Г. Сафиуллин (науч. ред.), В.Р. Аминева (сост.). – Казань, 2001. 346 с.
30. Українська література в загальнослов'янському і світовому літературному контексті: У 5 т. — К.: Наукова думка, 1987—1991.
31. Українське слово. Хрестоматія української літератури та літературної критики XX століття (в чотирьох книгах). – Київ: Аконіт, 2003.
32. Харчук Р. Сучасна українська проза: постмодерний період. – Київ: ВЦ «Академія», 2008. – 248 с.
33. Чижевський Д. Історія української літератури. – Тернопіль, 1994.
34. Чижевський Д. Культурно-історичні епохи // Українське слово: Хрестоматія укр. літератури та літ. критики. – Кн. 3. – Київ, 1994.
35. Чижевський Д. Початки і кінці нових ідеологічних епох // Історія філософії України: Хрестоматія. – Київ, 1993.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ І МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ВЫНІКОВАЙ АДЗНАКІ

Адзнака за адказы на практычных занятках можа ўключаць у сябе паўнату адказу, наяўнасць аргументаў, прыкладаў з мастацкіх твораў і г.д.

Пры ацэньванні рэферата (даклада) звяртаецца ўвага на: змест і паўнату раскрыцця тэмы, структуру і паслядоўнасць выкладу матэрыялу, бібліяграфічныя крыніцы і іх інтэрпрэтацыю, карэктнасць афармлення.

Ацэнка эсэ (сачынення, артыкула, творчай працы і г.д.) можа фарміравацца на аснове наступных крытэрыяў: арыгінальнасць (навізна) пастаноўкі праблемы і спосаба яе вырашэння, самастойнасць і аргументаванасць літаратуразнаўчых меркаванняў, карэктнасць выкарыстаных метадаў пры аналізе, граматнасць і стыль выкладу матэрыялу.

Пры ацэнцы адкрытага (эўрыстычнага) задання неабходна ўлічваць: самабытнасць (арыгінальнасць) створанага адукацыйнага прадукта, даследаванне вывучаемага феномена з розных бакоў, інтэгрыраванне ведаў з розных галін, уменне цэласнага аналізу мастацкага тэкста, асобасная значнасць дасягнутых вынікаў.

Пры ацэнцы тэматычных прэзентацый неабходна ўлічваць: арыгінальнасць створанага адукацыйнага прадукта, шматаспектнае даследаванне вывучаемай праблемы, міждысцыплінарны падыход, візуалізацыя і асобасная значнасць дасягнутых вынікаў.

Выніковая адзнака фарміруецца на аснове:

1. Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў (Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 53 ад 29.05.2012 г.);
2. Палажэння аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў БДУ (Загад рэктара БДУ ад 18.08.2015 г. № 382-ОД);
3. Крытэрыяў ацэнкі ведаў студэнтаў (ліст Міністэрства адукацыі ад 22.12.2003 г.)

Формай бягучай атэстацыі па спецсемінары “Украінская літаратура XIX – XX стст. у еўрапейскім кантэксце: параўнальна-тыпалагічны аспект” вучэбным планам прадугледжаны: IV семестр – залік.

Пры фарміраванні выніковай адзнакі выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэка ведаў студэнтаў, якая дае магчымасць прасачыць і ацаніць дынаміку працэсу дасягнення мэтаў навучання. Рэйтынгавая сістэма ацэньвання прадугледжвае выкарыстанне вагавых каэфіцыентаў для бягучага кантролю ведаш і бягучай атэстацыі студэнтаў па дысцыпліне.

Рэйтынгавая адзнака разлічваецца на аснове ацэнкі бягучай паспяховасці і экзаменацыйнай ацдзнакі з улікам іх вагавых каэфіцыентаў. Ацэнка бягучай паспяховасці складае 50%, заліковая адзнака – 50%.

Фарміраванне ацэнкі бягучай паспяховасці:

– адказы на практычных занятках – 50 %;
– напісанне эсэ (творчай работы) – 25 %;
– выкананне тэста – 25 %.

**ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДЛЯ КСР**

**Тэма 4.2 Паэтыка імпрэсіянізму ў навелістыцы М. Кацюбінскага. (2 гадз.)**

Імпрэсіянізм як плынь у мастацтве канца XIX – пачатку XX ст.
Імпрэсіянізм у літаратуры: характэрныя рысы, прадстаўнікі.
Адметныя рысы навелістыкі М. Кацюбінскага.
(Форма кантролю – пісьмовы тэст).

## Прыкладная тэматыка практычных заняткаў па вучэбнай дысцыпліне

### Тэма №1. Традыцыі еўрапейскага рамантызму ў творчасці Т. Шаўчэнкі

1. Асаблівасці славянскага рамантызму ў еўрапейскім кантэксце як літаратурнага напрамку першай паловы XIX ст.
2. Тарас Шаўчэнка як буйнейшы прадстаўнік украінскага рамантызму.
3. Аналіз балад і гістарычных паэм Шаўчэнкі як узору тыпова рамантычнай літаратуры.

**Літаратура:**

Ахрыменка П. Тарас Шаўчэнка і Беларусь. – Мінск, 1969.
Забужко О. Шевчеків міф України – Київ, 1997.
Кабржыцкая Т. В., Навойчык П. І., Рагойша У. В. Украінская літаратура: хрэстаматыя: вучэб. дапаможнік. У 5 ч. Ч. 2. Новая літаратура XIX ст. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск, 2009.
Наливайко Д. С. Спільність і своєрідність. Українська література в контексті європейського літературного процесу. — К.: Дніпро, 1988.
Украінская літаратура і ўкраінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі : вучэб. дапам. У 3 ч. Ч. 1. Эпоха Сярэднявечча — XIX ст. / Т. В. Кабржыцкая, У. В. Рагойша ; пад рэд. Т. В. Кабржыцкай. — Мінск : БДУ, 2012.

### Тэма №2.Вобраз Каіна ў аднаіменнай паэме Дж.Байрана і паэме І.Франко “Смерць Каіна”

1. Ідэйны зместа паэмы “Каін” Дж. Байрана.
2. Вобраз Каіна ў паэме І. Франко “Смерць Каіна”.
3. Агульнае і адрознае ў творах: параўнальна-тыпалагічны аспект.

**Літаратура:**

Афонина О. Послесловие // Байрон Дж.Г. Избранное. – М: Правда, 1986 – с. 417 – 445.
Богословский В.Н. и др. История зарубежной литературы XIX века. // В.Н. Богословский. – М.: Высшая школа, 1991
Кабржыцкая Т. В., Навойчык П. І., Рагойша У. В. Украінская літаратура: хрэстаматыя: вучэб. дапаможнік. У 5 ч. Ч. 2. Новая літаратура XIX ст. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск, 2009.
Каспрук Арсен. Філософські поеми Івана Франка. — Київ, 1965.

## Тэма №3. Імпрэсіянізм у навелістыцы М. Кацюбінскага

1. Імпрэсіянізм як плынь мастацтва.
2. Буйнейшыя прадстаўнікі імпрэсіянізму ў сусветнай літаратуры.
3. Паэтыка імпрэсіянізму ў навелістыцы М. Кацюбінскага.
3. Аналіз адной навелы М. Кацюбінскага *(на выбар)*.

**Літаратура:**

Андреев Л.Г. Импрессионизм. М., 1980.
Гісторыя славянскіх літаратур і праблемы іх параўнальнага вывучэння: тэорыя і практыка : вучэб. дапам. / склад. П. І. Навойчык ; пад агул. рэд. Т. В. Кабржыцкай, М. М. Хмяльніцкага. – Мінск : БДУ, 2015. – 207 с.
Денисюк І. Розвиток української малої прози XIX–поч.XXст. Львів, 1999.
Ревальд Дж. История импрессионизма. М., 1994.

## Тэма №4. Драматургія М. Куліша ў еўрапейскім кантэксце

1. Жыццёвы і творчы шлях М. Куліша.
2. Тэндэнцыі развіцця еўрапейскай драмы і творчасцьукраінскага пісьменніка: параўнальна-тыпалагічны аспект.
3. “Дні Турбіных” М. Булгакава і “Патэтычная саната” М. Куліша.

**Літаратура:**

Задорожный М. Тайнопис Булгакова і Куліша // Персонал Плюс№ 46 (451) 16 - 22 листопада 2011.
Кабржыцкая Т. В. «Тутэйшыя» і нетутэйшае: украінскі кампанент драматургіі Янкі Купалы // Славянскія літаратуры: Праблемы развіцця. Зборнік артыкулаў. – Мінск., 2003.
Кузякіна. Н. Б. П’єси Миколи Куліша. – Київ, 1970.
Навойчык П. І. «Хачу міру ў людзях і чалавечнасці» (Мікола Куліш) // Славянскія літаратуры: Постаці (ІІ). Зборнік артыкулаў. – Мінск, 2003.
Панченко В. Арки і шибениці: Драматургія М. Куліша. – Кіровоград, 1997.
Семенюк Г. М. Куліш і становлення української драматургії. – Київ, 1991.

## АПІСАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ ПАДЫХОДАЎ І МЕТАДАЎ ДА ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваюцца:

1.***Эўрыстычны падыход***, які мае на мэце:

- ажыццяўленне студэнтамі асобасна-значных адкрыццяў акаляючага свету;
- дэманстрацыю шматстайнасці рашэнняў большасці прафесійных задач і жыццёвых праблем;
- творчую самарэалізацыю навучэнцаў у працэсе стварэння адукацыйных прадуктаў;
- індывідуалізацыю навучання праз магчымасць самастойна ставіць мэты, ажыццяўляць рэфлексію асабістай адукацыйнай дзейнасці.

2.***Практыка-арыентаваны падыход***, які мае на мэце:

- засваенне зместу адукацыі праз рашэнне практычных задач;
- набыццё навыкаў эфектыўнага выканання розных відаў прафесійнай дзейнасці;
- арыентацыю на генерыраванне ідэй, рэалізацыю індывідуальных (групавых) студэнцкіх праектаў;
-выкарыстанне працэдур, спосабаў ацэньвання, якія фіксуюць сфарміраванасць прафесійных кампетэнцый.

3. ***Метад праектнага навучання***, які мае на мэце:

- спосаб арганізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў, які развівае актуальныя для вучэбнай і прафесійнай дзейнасці навыкі планавання, самаарганізацыі, супрацоўніцтва і накіраваны на стварэнне асабістага прадукта;
- набыццё навыкаў для рашэння даследчых творчых, сацыяльных і камунікатыўных задач.

4.***Метады і прыёмы развіцця крытычнага мыслення***, якія ўяўляюць з сябе сістэму, якая фарміруе навыкі работы з інфармацыяй у працэсе чытання і пісьма; разумення інфармацыі як адпраўной, а не канчатковай кропкі крытычнага мыслення.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ НАВУЧЭНЦАЎ

Для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне“Украінская літаратура XIX–XX стагоддзяў у еўрапейскім кантэксце: параўнальна-тыпалагічны аспект (спецсемінар)” неабходна выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныя рэсурсы: размясціць на адукацыйным партале комплекс вучэбных і вучэбна-метадычных матэрыялаў (вучэбна-праграмныя матэрыялы, вучэбныя выданні для тэарэтычнага вывучэння дысцыпліны, матэрыялы бягучага кантролю і бягучай атэстацыі, якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вучэбгай дзейнасці студэнтаў патрабаванням адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі і вучэбна-праграмнай дакументацыі, у тым ліку пытанні да падрыхтоўкі да заліку,

заданні, тэсты, пытанні для самакантролю, тэматыка рэфератаў і інш., спіс рэкамендуемай літаратуры, інфармацыйных рэсурсаў і інш.

### ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТЫЎНЫХ РАБОТ

1. Нацыянальная спецыфіка ўкраінскага рамантызму.
2. Жанравая парадыгма паэзіі ўкраінскага рамантызму.
3. Рамантычныя традыцыі ў паэзіі Тараса Шаўчэнкі
4. Пераклады вершаў і паэм Тараса Шаўчэнкі на беларускую мову.
5. Развіццё жанру філасофскай паэмы ў творчасці І.Франко.
6. Малая проза М.Кацюбінскага і А.П.Чэхава: параўнальна-тыпалагічны аспект.
7. Навелістыка В. Стэфаніка і паэтыка экспрэсіянізму.
8. Ідэі фемінізму ў творчасці В. Кабылянскай і яе сучаснікаў.
9. ЛірыкаА.Олэся ў кантэксце еўрапейскага сімвалізму.
10. Жанр драматычнай паэмы ў творчай спадчыне Лесі Украінкі і Янкі Купалы: параўнальна-тыпалагічны аспект.
11. Тэндэнцыі развіцця еўрапейскай драмы 20-х гадоў ХХ ст. і творчасць М. Куліша: параўнальна-тыпалагічны аспект.
12. Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі 20-х гадоў ХХ ст.
13. Пераклады паэзіі М. Рыльскага на беларускую мову.
14. М. Рыльскі як перакладчык сусветнай класікі.
15. Пераклады паэзіі П. Тычыны на беларускую мову.
16. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці Р. Іванычука і У. Караткевіча: агульнае і адметнае.
17. Гуманістычны пафас прозы А. Ганчара і І. Мележа.
18. Творчасць “нью-йоркскай групы” і пакалення “шасцідзесятнікаў”.
19. Мастацкія вектары ўкраінскай літаратуры канца ХХ ст.
20. Постмадэрнізм і ўкраінская літаратура мяжы ХХ – ХХІ стагоддзяў.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Задачы параўнальнага літаратуразнаўства.
2. Гісторыка-літаратурны працэс як аб’ект тыпалагічнага даследавання.
3. Паняцце ўплываў і запазычанняў у літаратуразнаўстве.
4. Паняцце запазычанняў тыпалагічных падабенстваў і адрозненняў.
5. Літаратурныя напрамкі і плыні ў кантэксце параўнальна-тыпалагічных даследаванняў.
6. Нацыянальна-гістарычная адметнасць украінскага рамантызму.
7. Дасягненні ўкраінскага рамантызму ў творчасці Тараса Шаўчэнкі ў кантэксце еўрапейскага рамантызму.
8. Жанрава-тэматычны дыяпазон украінскага і еўрапейскага рэалізму: агульнае і адметнае.
9. Праявы еўрапейскага мадэрнізму ў украінскай літаратуры.
10. Імпрэсіянізм у літаратуры: навелістыка М. Кацюбінскага.
11. Экспрэсіянізм у літаратуры: малая проза В. Стэфаніка.

12. Ідэі фемінізму ў заходнееўрапейскай літаратуры і творчасці В. Кабылянскай
13. Неарамантызм як плынь у літаратуры пачатку XX ст.
14. Тэндэнцыі развіцця драматургічных жанраў у 20-30 гады XX ст. у заходнееўрапейскіх літаратурах і творчасці ўкраінскіх пісьменнікаў.
15. Літаратурныя групы 20-х гадоў XX ст. Савецкай Украіны і іх праграмы ў агульнаерапейскім кантэксце.
16. Гуманістычны пафас еўрапейскай і ўкраінскай ваеннай прозы.
17. Тэма вайны ў асэнсаванні ўкраінскіх і беларускіх пісьменнікаў.
18. Постмадэрнісцкія тэндэнцыі ва ўкраінскай літаратуры канца XX – пачатку XXI стагоддзяў.
19. Асаблівасці параўнальнага аналізу лірычных твораў.
20. Асаблівасці параўнальнага аналізу эпічных твораў.
21. Асаблівасці параўнальнага аналізу драматычных твораў.
22. Пераклад як форма кантактных сувязей.
23. Пераклады лірыкі Т. Шаўчэнкі на беларускую мову.
24. М. Рыльскі як перакладчык еўрапейскай класікі.
25. Узаемасувязі М.Рыльскага з беларускай літаратурай.
26. П. Тычына і беларуская літаратура.
27. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай літаратуры XX ст. і ўкраінскі літаратурны працэс.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай прaграмыпа вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (украінская) | Кафедра тэорыі літаратуры | няма | Зацвердзіць Пратакол №10 ад 22.06.2018 г. |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
на _____/_____ вучэбны год

| №№ пп | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбнаяпраграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол № ____ ад ________ 20_ _ г.)

Загадчык кафедры

_______________________ ________________ ___________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
прафесар ________________ __І.С. Роўда_____
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы